ROCZNIKI HUMANISTYCZNE
Tom LI, zeszyt 7 – 2003

БЭАТА СІВЭК

# СВЕТ ЛІРЫЧНЫХ МІНІЯЦЮР ЗМІТРАКА БЯДУЛІ

Лірычная імпрэсія, лірычная мініяцюра, абразок – гэта назвы літаратурнага жанра, што стаіць на мяжы паэзіі і прозы. У беларускай літаратуры ён з’явіўся ў пачатку XX-га стагоддзя, першым творам былі *Думкі ў дарозе* Якуба Коласа. Доўгі час лірычнай мініяцюры адмаўлялі ў жанравай самастойнасці. Упершыню пра мініяцюру як самастойны жанр напісаў Уладзімір Калеснік. У сваіх літаратуразнаўчых эсэ *Здымак у жыце* і *Усё чалавечае* ён разглядае лірычную мініяцюру ў кантэксце развіцця нацыянальнай літаратуры і звязвае абразкі Янкі Брыля з імпрэсіямі Бядулі, з вершам *Я хацеў бы спаткацца з вамі* Максіма Багдановіча і прытчай *Юдава поле*[1]. У. Калеснік таксама ўпершыню ў дачыненні да мініяцюры загаварыў пра інтэграцыю жанраў, якая адбываецца не толькі ў паэзіі, але і ў прозе. Ганна Кісліцына ў кнізе *Лірычная мініяцюра як жанр беларускай літаратуры* сцвярджае, што мініяцюра, якая на працягу XX ст. дастаткова выразна акрэсліла пэўнае кола асваення рэчаіснасці, мае спецыфічную арганізацыю тэксту і адпавядае тром галоўным прыкметам жанру як гістарычна акрэсленага, адносна ўстойлівага тыпу мастацкага твора, што вылучаецца на падставе прыналежнасці да пэўнага літаратурнага роду, згодна з пераважаючай эстэтычнай якасцю, кіруючыся аб’ёмам і адпаведнай структурай твора[2].

---

Dr BEATA SIWEK – adiunkt Katedry Literatur Słowiańskich w Instytucie Filologii Słowiańskiej KUL; adres do korespondencji: ul. Dzieci Zamojszczyzny 3; 20-811 Lublin; e-mail: beartkas@kul.lublin.pl

[1] Глядзі таксама: У. К а л е с н і к, *Зорны спеў*, Мінск 1975; У. К а л е с н і к, *Янка Брыль: Нарыс жыцця і творчасці*, Мінск 1990; У. К а л е с н і к, *Усё чалавечае*, Мінск 1993.

[2] Г. М. К і с л і ц ы н а, *Лірычная мініяцюра як жанр беларускай літаратуры*, Мінск 2000, с. 8.

Паспробуем бліжэй прыгледзіцца да гэтага жанра, прааналізаваўшы цыкл лірычных мініяцюр самага выдатнага прадстаўніка беларускага імпрэсіянізму – Змітрака Бядулі[3]. Спачатку паставім пытанне: у чым сутнасць імпрэсіянізму?

У аснове імпрэсіяністычнага мастацтва – уражанне, impression (франц.), г. зн. эмацыйны вобраз, які не паддаецца дакладнаму, лагічна строгаму апісанню, навуковай рэгламентацыі. Імпрэсіяністычнаму твору ўласцівыя апора на першасны пачуццёвы вобраз, які ўзнікае пры непасрэдным, «свежым» поглядзе на прадмет, і імкненне замацаваць менавіта гэтае, ледзь узніклае, няхай нават беглае ўражанне ад прадмета ці пазначыць яго кідкай дэталлю[4],

– сцвярджае беларускі літаратуразнаўца Любоў Тарасюк. Кароткі і адначасова вельмі трапны адказ на пастаўленае пытанне знаходзім таксама ў кнізе польскага даследчыка A. Hausera *Społeczna historia sztuki*:

Panowanie chwili nad trwałością i stałością, uczucie, że każde zjawisko jest przemijającą, jednorazową konstelacją, przepływającą falą rzeki, do której nie można wejść dwukrotnie, stanowi najprostszą formułę, do jakiej można sprowadzić impresjonizm[5].

W. Juszczak, вядомы польскі літаратуразнаўца дадае:

impresjoniści uczynili ośrodkiem swoich zainteresowań subtelne, krótkotrwałe przemiany, jakim wciąż podlega zmysłowy, a ściślej: sam wzrokowy obraz przedmiotów, barwy i kształty wciąż inaczej modelowane wpływem światła, zależnie od zmian atmosferycznych, ukazujące się w ciągłym ruchu, odbierane jako nieustanne falowanie bezpowrotnie ginących wrażeń, nieustająca metamorfoza rzeczywistości, jako czegoś nietrwałego[6].

Знаёмства з мадэрністычнымі плынямі таго часу, актыўнае развіццё якіх зышлося з творчым развіццём Бядулі, а таксама з яго выхаваннем – чыста рэлігійнай адукацыяй у жыдоўскіх школах, спачатку ў хедэры, затым у ешыбоце дазваляе нам зразумець спецыфіку і багацце гэтай творчасці:

У дзесяць год я ўжо някепска ведаў стараяўрэйскую мову. У біблії і талмудзе я ахвотна чытаў раздзелы, насычаныя легендамі і апавяданнямі. У дзедавай бібліятэцы я натрапіў на зборы легенд і казак аб розных святых: *Шыхвее баал шэм*, *Ялкут, Цэена Урэена* і шмат іншых. Кожны раз перад сном я імі зачытваўся. Дзівосная фантастыка аб анёлах, чарцях, русалках і святых, распісаных у падобных кніжках яркімі фарбамі, палохала мяне, дзівіла і захапляла[7]

– падкрэслівае Бядуля ў аутабіяграфічнай повесці *У дрымучых лясах*.

---

[3] Змітрок Бядуля гэта літаратурны псеўданім Самуіла Плаўніка.
[4] Л. Т а р а с ю к, *Імпрэсіянізм у беларускай літаратуры*, «Роднае слова», № 4, 2001, с. 12.
[5] A. H a u s e r, *Społeczna historia sztuki i literatury*, t. 2, Warszawa 1974, s. 316.
[6] W. J u s z c z a k, *Postimpresjoniści*, Warszawa 1985, s. 21.
[7] З. Б я д у л я, *У дрымучых лясах, Збор твораў у пяці тамах*, т. 3, Мінск 1985-89, с. 278.

Першыя літаратурныя захапленні паўплывалі на творчасць Бядулі, а перад усім адлюстраваліся ў ягоных лірычных мініяцюрах. Лірычнай мініяцюрай быў першы друкаваны твор Бядулі *Пяюць начлежнікі*, надрукаваны ў газеце «Наша ніва» ў 1910 годзе, а зборнікам лірычных імпрэсій – ягоны першы друкаваны зборнік *Абразкі*[8], які выйшаў у свет у 1913 годзе ў Пецярбургу ў выдавецтве «Загляне сонца і ў наша ваконца». Усе творы, што ўвайшлі ў гэты зборнік былі зноў апублікаваны ў тым жа самым годзе ў альманаху «Маладая Беларусь». Па невядомым прычынам у зборнік не ўвайшла першая імпрэсія *Пяюць начлежнікі*, а таксама абразкі *Не пячы гэтак сонейка*, *Стары пастыр*, *У час змяркання*, *Ля кросен*, *Здалося мне, што струны нейкія рваліся*, сабраныя ў цыкл пад знаёмай назвай *Мірыям* і апублікаваныя год раней у газеце «Наша ніва». І хаця ў творчасці Бядулі многа чыста лірычных твораў (у 1913 г. ён апублікаваў паэтычны зборнік *Пад родным небам*), але менавіта імпрэсіі былі ахвотна і часта друкаваныя ў «Нашай ніве» і гэта яны – як сцвярджае І. Навуменка – «зрабілі яму імя»[9]. У вершаваных і празаічных імпрэсіях Бядулі мы бачым супольную тэндэнцыю да сінтэза імпрэсіяністычных і рамантычных элементаў. Рамантызм бядулеўскіх мініяцюр, паводле І. Навуменкі, звязаны, па-першае, з дзіцячымі ўражаннямі ад жыцця, па-другое, з рэлігійнай фантастыкай, якую ён чэрпаў з Бібліі і з той творчай школай, якую атрымаў Бядуля ў «Нашай ніве»[10].

Шматлікія з іх выражаюць адначасова рамантычную антыномію духу і быцця, мары і рэальнасці[11]. У лірычных імпрэсіях Бядулі дамінуе настрой, які можа быць створаны з дапамогай розных літаратурных сродкаў. Важную ролю тут адыгрывае мелодыка радка, зменлівасць эмоцый, пытальная інтанацыя, стылізацыя і эўфаналагічная арганізацыя твора. В. Каваленка ў сваёй кнізе *Пошукі і здзяйсненні* заўважае, што асаблівасці формы абразкоў выразна паказваюць на іх моцную сувязь з ранняй паэзіяй. Аўтар тут не адмяжоўвае сябе ад лірычнага героя і захоўвае многія прыёмы лірычнага жанру, як, на прыклад, непасрэдная размова з чытачом. У абразках заўважаем таксама лірычны лад апавядання: інверсійную пабудову фраз, іх рытмічную арганізацыю, празмерную метафарычнасць мовы[12]. Лірычны герой мініяцюр Бядулі

[8] У пятнаццаць гадоў З. Бядулю абвінавацілі ў здрадзе яўрэйству і выгналі з ешыбота за напісаную ім кнігу вершаў-гімнаў *Мірыям*.

[9] І. Н а в у м е н к а, *Змітрок Бядуля*, Мінск 1995, с. 22.

[10] Там жа, с. 19.

[11] Пар. Т а р а с ю к, *Імпрэсіянізм у беларускай літаратуры*, с. 15.

[12] Пар. В. А. К а в а л е н к а, *Пошукі і здзяйсненні*, Мінск 1963, с. 35.

мае шмат агульных рысаў з самім аўтарам, іх характары мала чым адрозніваюцца. А як знаёмыя ўспамінаюць самога пісьменніка?

> З. Бядуля быў чалавек эмацыянальны, уражлівы і няўстойлівы, схільны да мімалётных захапленняў... Чалавек настрою, З. Бядуля амаль кожны дзень быў не такі, як учора. Сёння ён ахоплен энтузіязмам і прадбачыць вялікія перспектывы ў літаратурным жыцці, а заўтра скардзіцца на свой лёс і шкадуе, што стаў пісьменнікам[13]

– піша ў артыкуле пра Бядулю В. Вольскі. Імпрэсіі Бядулі, хаця часта гаворыцца ў іх пра звычайную беларускую бяду, нядолю, поўныя захаплення прыгажосцю свету, ягонай неразгаданасцю, таямнічасцю, багаццем. Лірычныя мініяцюры разнастайныя па сваёй тэматыцы. Ёсць сярод іх творы пра каханне (*Спатканне*, *Не пазірай на мяне*, *Загадка*), сацыяльна-бытавыя (*За тканінай*, *Пяюць начлежнікі*, *Пастушка*, *Пяць лыжак заціркі*), рэлігійна-філасофскія (*На гай высокі*, *У досвітку*, *Зямля*). Пісьменнік раскрывае перад намі вобразы пастушкі, работнікаў ля вапеннай гары, аратага, бабулі, якая памірае без споведзі (*Кветка*, *Ля вапеннай гары*, *Без споведзі*), піша таксама пра жаночую долю, пра маладую дзяўчыну, якую выдалі замуж супраць яе волі, пра цяжкі лёс вясковых ткачых, звяртаецца да праблемы вернасці (*Плач пералескаў*, *Снілася мне казка*, *Восенню*, *Яе душа*, *За тканінай*, *Шчасце не ў золаце*, *На прашчанні*). У гэтых імпрэсіях Бядуля выкарыстоўвае рэалістычную манеру пісьма, адсланяе жыццё беларускіх сем'яў, іх незадаволенасць жыццём, імкненне вырвацца з яго няволі. Бядуля дасканала злучае ў адным творы традыцыі рэалістычнай прозы з уласнымі наватарскімі паэтычнымі прынцыпамі:

> Ціха зрабілася ў хаце. Цені ад газніцы дрыжалі на закураных сценах. Дзеткі, перапуджаныя мяцеліцай, каторая гудзела на дварэ, сціснуліся ў адну кучку і нават шаптацца перасталі. Высунутая пажоўклая рука бабулькі ўжо не дрыжала, бо бабулька, не дачакаўшыся папа, памерла без споведзі...[14]

У цэнтры паэтычнага свету лірычных мініяцюр Бядулі амаль заўсёды знаходзіцца праблема самотнасці адзінкі, у іх пануе агульны настрой суму, настальгіі, задуменнасці. Праблема адзіноты прымае розныя формы і рэалізуецца па рознаму:

> Я ў кусочкі паламлю саху сваю, быкоў сваіх на волю пушчу, кіну добрым суседзям морг свой камяністы і пайду брысці на дзікае балота – далёка ад людзей. Ля завадзі сярод чароту, сяджу я, схілены ў тры пагібелі, і не ўстану, не пайду, пакуль не зразумею самы лад жыцця людскога як мае быць...[15]

---

[13] В. Вольскі, *Пра Змітрака Бядулю*, «Маладосць» 1966, № 4, с. 93.

[14] З. Бядуля, *Без своведзі*, у: *Апавяданні*, Мінск 1989, с. 22.

[15] З. Бядуля, *На гай высокі*, там жа, с. 19.

Бядуля глыбока перакананы, што свядома выбіраючы шлях паэта, трэба разумець, што на гэтым складаным шляху творцу заўсёды чакае самотнасць. Бядуля падкрэслівае тоеснасць лёсу лірычнага «я» і «ты», адначасова кладзе націск на супольнасць дзвюх творчых душ. Ён засяроджваецца таксама на праблеме экзістэнцыяльнай самотнасці адзінкі, самотнасці якая ўзнікае з самога быцця і ёсць наканаваннем чалавека. Безнадзейнасць, страх, боль і мучэнні, якія герой перажывае ў адзіноце, робяць ягоную самотнасць абсалютнай. Пасіўнасць ў адносінах да яе, замкнёнасць у коле негатыўных перажыванняў спраўляе, што гэтая самотнасць робіцца ўсеабдымнай:

> Слязамі мачу я шаўковыя тканіны панскія, кожны новы ўзор новым ўздыхам спатыкаю. З кожным новым днём новай хваробай хварэю...Балючы крыж мой хіліцца...[16]

У такім цяжкім экзістэнцыяльным перажыванні важна знайсці хаця б хвіліну спакою, хаця б на момант забыцца пра рэальны свет. Шанцам для героя лірычных мініяцюр, які хоча адарвацца ад сумнай і балючай рэчаіснасці ёсць зварот да мінуўшчыны. Усё, што звязана з мінулым, мае заўсёды неацэненую вартасць. У шматлікіх абразках Бядулі героі перамагаюць настроі неспакою, бязвер'я, самотнасці. Стан шчасця, задавальненне, пачуццё унутранага спакою вынікае з таго, што герой Бядулі набліжаны да свету, прыроды, ён шмат назірае і бачыць у прыродзе самага блізкага сябра. Паглыбленне ў настальгічную, напоўненую спакоем прастору дазваляе дасягнуць унутранай гармоніі:

> Зямля! Вялікі, бязмерны абшар зямлі адкрываецца воку майму. Я падымаюся вышэй і вышэй на нейкіх скрыдлах, з дзівам разглядаю велізарнае ўладарства зямлі... Як у казцы, нясуцца прада мной пары года: святая зялёная вясна, гарачая залатое лета, сытая багатая восень, бліскучая здаровая зіма... І мяняюцца фарбы, і мяняюцца віды...[17]

Гэтая своеасаблівая любоў да прыроды ёсць доказам уражлівасці паэта на з'явы навакольнага свету. Бядуля мае небывалы талент да стварэння настраёвых пейзажаў, да аб'яднання самых розных ўражанняў у невялікіх творах. Заўважальна таксама і спецыфічная эмацыянальная насычанасць ягоных літаратурных твораў і імкненне да адлюстравання зменлівых, мімалётных псіхалагічных станаў чалавека. Такім чынам прыходзім да высновы, што ў творах Бядулі лірычнае адчуванне рэчаіснасці з'яўляецца крыніцай імпрэсіяністычнага ўспрыняцця свету. Абвостраны зрок дазваляе заўважыць і запісаць мноства зменлівых станаў навакольнага свету, дынамізм развіцця

---

[16] З. Б я д у л я, *За тканінай*, там жа, с. 19.
[17] З. Б я д у л я, *Зямля*, у: *Збор твораў*, т. 2, с. 41.

натуры. Адсюль такое моцнае захапленне ўсім тым, што нетрывалае, зменлівае і мімалётнае ў рэальным свеце:

> Зірнула яна на мяне, а ў гэты самы момант месяц зірнуў на яе. Шаўковымі хвалямі былі распушчаны валасы на плячах. Ад іх ляглі на твары паўцені, і вочы глыбокімі зрабіліся, а яна зрабілася таемнай – здаецца, любіла і не любіла, жартавала і не жартавала, не то клікала да сябе, не то адганяла... І я не мог разгадаць...[18]

У працытаваным творы істотную ролю адыгрывае спецыфічны паралелізм станаў душы і пейзажу. Паэтычны вобраз напоўнены гульнёй колераў, святла і гукаў. Дамінацыя лірычнай стыхіі і поўная суб'ектывізацыя рэалій: сігналы пра духоўны стан героя, нюансы яго псіхічных настрояў, зварот да форм лірычнага маналогу і ўскоснай мовы – гэта істотныя элементы бядулевай творчасці. У далучэнні чалавека да прыроднай гармоніі, да незвычайнай прыгажосці, якая была разлітая навокал яго, бачыў Бядуля важную натхняльную сілу. Высокая ступень мeладычнасці мовы зацірае граніцы паміж творам празаічным і вершаваным. Стыль твораў Бядулі багаты эпітэтамі, якія акрэсліваюць шырокі спектр фарбаў і гукаў: чырвоны слуп, цёмнае неба, шаўковыя хвалі, чорныя вольхі, белыя туманы, закацістая песня. Шматлікія пейзажы ў абразках З. Бядулі – гэта пейзажы зробленыя адразу, пад уплывам першага ўражання. Характэрнай рысай гэтых твораў ёсць уніклівасць гледжання, цікавая ігра святла і змроку, дня і ночы, сонца і дажджу. Адным з любімых мастацкіх прыёмаў Бядулі было выкарыстанне кантрасту і асіметрыі. Бядуля абапіраецца, як заўважалася раней, на факты з уласнага жыцця, звяртаецца да асабістых перажыванняў і адчуванняў, уводзіць іх у біяграфію сваіх герояў. Усё гэта дапамагае чытачу атаясамліваць героя з самім пісьменнікам і лепш зразумець яго індывідуальныя настроі.

Героі твораў Бядулі – гэта асобы, у якіх чуллівая душа. Тое, што некаму здаецца нявартым увагі, героі твораў Бядулі ўспрымаюць як здарэнне. Розныя эмоцыі – неспакой, трывога, жах – вырастаюць як быццам з нічога: з кування зязюлі, шэпту лістоты, незвычайнага заходу сонца:

> Нешта казачнае бачу я ў багатых колерах неба... Нешта таемнае варожыць мне вячэрняя зорка... Сэрца маё пэратлумачыць сабе гэтыя дзіўныя малюнкі. Цені кладуцца над вёскай, цені гусцеюць на канюшыне за пусткай, і неяк робіцца сумна-сумна...[19]

Анафарычны паўтор *нешта* акцэнтаваны і выдзелены ў сэнсавым плане самім аўтарам. В. П. Жураўлёў у кнізе *У пошуку духоўных ідэалаў* сцвярд-

[18] З. Б я д у л я, *Загадка*, у: *Анталогія беларускага апавядання*, рэд. М. Лынькоў, Мінск 1967, с. 76.

[19] З. Б я д у л я, *Прытуліся ка мне*, у: *Апавяданні*, с. 18.

жае, што такая інтэрпрэтацыя жыццёвай рэальнасці абумоўліваецца тут своеасаблівасцю творчай індывідуальнасці самога пісьменніка і своеасаблівасцю яго пазнавальна-метадалагічнай творчай сістэмы, якая ў дыялогу з жыццём падкрэслена настройвалася на імпрэсіяністычную хвалю, на голас сэрца і тонкага, нюансавага адчування і перажывання. Гэтая тэндэнцыя ў беларускай літаратуры пэўнага перыяду была глыбока ўнутранай патрэбай развіцця нацыянальнага мастацкага слова, якому на той час яшчэ вельмі бракавала псіхалагічнай выяўленча-вобразнай моцы ў раскрыцці чалавечых характараў і абставін[20].

Настрой чалавечай душы ў мініяцюрах Бядулі знаходзіцца ў суладдзі з уражаннем ад вячорнай цішыні, спакою. Прырода і чалавек знаходзяцца пад уплывам гэтых жа самых настрояў. Героям лірычных мініяцюр Бядулі спадарожнічае прадчуванне, чаканне нечага незвычайнага, страх перад новым, а часам нават містычны неспакой. Бядуля хоча паглыбіць і пашырыць унутраны свет асобы і паказвае супярэчлівасць гэтых перажыванняў. Як сцвярджае І. Навуменка, Бядуля «як бы прыўздымае заслону над стоенымі глыбінямі свядомасці і падсвядомасці»[21].

Чалавек адчувае, што жыццё ў ім самім і навокал яго сатканае з далікатнай, тонкай матэрыі. Яно адначасова загадкавае і зменлівае ў сваіх адценнях і немагчыма яго назваць інакш, як толькі неакрэсленымі займеннікамі (нешта, штосьці). Гэты своеасаблівы мікракосмас жыве ўласным жыццём, але ён таксама звязаны з наваколлем. У гэтай рэчаіснасці амаль усё ёсць нетрывалае, мімалётнае, усё знаходзіцца на сутыку рэальнасці і суб'ектыўнага адчування. Вельмі цікавая таксама інструментоўка Бядулевых твораў. Дзякуючы ёй, аўтар змог стварыць непаўторнае, пластычнае апісанне, цікавую метафару, падкрэсліць настрой. Даволі часта карыстаецца Бядуля паўзай, шматкроп'ем, неакрэсленымі займеннікамі: чыйсьці, дзесьці, якісьці, інверсіўным парадкам слоў у сказе, анафарыстычнымі паўторамі ці сінтаксічнымі паралелізмамі:

> Ёсць розныя героі ў жыцці. Ёсць гэткія, якія паміраюць за свайго далёкага бога ў небе, з верай, што яны там, у раю, будуць весяліцца. Ёсць гэткія, што канчаюць жыццё на вайне з уцехай, што ўся краіна будзе іх шкадаваць [...] Ёсць гэткія, што з безгранічным фанатызмам гінуць за сваю ідэю на шыбеніцы...[22]

---

[20] Пар. В. П. Ж у р а ў л ё ў, *У пошуках духоўных ідэалаў. На матэрыяле беларускай літаратуры XIX-пачатку XX ст.*, Мінск 2000, с. 142.

[21] Н а в у м е н к а, *Змітрок Бядуля*, с. 15.

[22] З. Б я д у л я, *Без споведзі*, у: *Апавяданні*, с. 23.

Элементамі, якія звязаныя са сферай меладычнай арганізацыі твораў, з'яўляюцца таксама гукаперaймальныя словы і няўмысны паўтор слоў, славазлучэнняў альбо вобразаў:

> Пяюць начлежнікі... Шчыры напевы іх і поўны задумы, як цёмнае неба, каторае навісла над імі, як белыя туманы над рэчкай, атуляюць яны душу тваю, і на клік гэтай песні звіняць струны твайго сэрца, а ў вачах слёзы блішчаць... Пяюць начлежнікі...[23]

З. Бядуля ў сваіх творах звяртае ўвагу на пластычную сферу. Колеры выступаюць у розных паўтонах і адценнях. Ад таго паўстае ўражанне, што гэта святло стварае непаўторнасць паасобных прадметаў. Дынаміка святла і ценяў выяўленая ў творах Бядулі – гэта манера характэрная для імпрэсіяністаў.

Адной з найбольш істотных функцый імпрэсіяністычнай манеры Бядулі імкненне настроіць чалавека на тое, каб ён зірнуў больш шырока на акаляючы яго свет, каб дакладней мог ён зразумець усё тое, што адбываецца ў штодзённай рэчаіснасці. Нават звычайная будзённасць у шматлікіх творах Бядулі ёсць падпарадкавана агульнаму закону высокага пафасна-рамантычнага стылю і адпаведным чынам трансфармуецца.

Няма сумненняў, што лірычныя мініяцюры Змітрака Бядулі, якім прысвечаны наш артыкул, займаюць важнае месца ў гісторыі беларускай літаратуры і ёсць доказам таго, што Бядуля ў істотны спосаб уплываў на мастацкія пошукі маладзейшых творцаў і ў праблемна-тэматычным і стылёва-жанравым накірунку ў паслякастрычніцкі час.

## БІБЛІЯГРАФІЯ

Б я д у л я З.: Без своведзі, у: Апавяданні, Мінск 1989, с. 22.
— Без споведзі, у: Апавяданні, Мінск 1989, с. 23.
— За тканінай, у: Апавяданні, Мінск 1989, с. 19.
— Загадка, у: Анталогія беларускага апавядання, рэд. М. Лынькоў, Мінск 1967, с. 76.
— Зямля, у: Збор твораў у пяці тамах, т. 2, Мінск 1985-1989, с. 41.
— На гай высокі, у: Апавяданні, Мінск 1989, с. 19.
— Прытуліся ка мне, у: Апавяданні, Мінск 1989, с. 18.
— Пяюць начлежнікі, у: Апавяданні, Мінск 1989, с. 14.
— У дрымучых лясах, у: Збор твораў у пяці тамах, т. 3, Мінск 1985-1989.
В о л ь с к і В.: Пра Змітрака Бядулю, «Маладосць» 1966, № 4, с. 93.
Ж у р а ў л ё ў В. П.: У пошуках духоўных ідэалаў. На матэрыяле беларускай літаратуры XIX-пачатку XX ст., Мінск 2000.

[23] З. Б я д у л я, *Пяюць начлежнікі*, у: *Апавяданні*, с. 14.

К а в а л е н к а В. А.: Пошукі і здзяйсненні, Мінск 1963.
К а л е с н і к У.: Зорны спеў, Мінск 1975.
— Усё чалавечае, Мінск 1993.
— Янка Брыль: Нарыс жыцця і творчасці, Мінск 1990.
К і с л і ц ы н а Г. М.: Лірычная мініяцюра як жанр беларускай літаратуры, Мінск 2000.
Н а в у м е н к а І.: Змітрок Бядуля, Мінск 1995.
Т а р а с ю к Л.: Імпрэсіянізм у беларускай літаратуры, «Роднае слова», № 4, 2001, с. 12-15.
H a u s e r A.: Społeczna historia sztuki i literatury, t. 2, Warszawa 1974.
J u s z c z a k W.: Postimpresjoniści, Warszawa 1985.

## ŚWIAT LIRYCZNYCH MINIATUR ZMITRAKA BIADULI

S t r e s z c z e n i e

Liryczne miniatury Zmitraka Biaduli (wł. Samuel Płaŭnik), najwybitniejszego przedstawiciela nurtu impresjonistycznego w literaturze białoruskiej, zajmują szczególne miejsce w jego dorobku twórczym. Biadula odznacza się niebywałą umiejętnością tworzenia nastrojowych pejzaży, zamykania licznych wrażeń w tak „drobnych" utworach. Zauważamy w nich specyficzne nasycenie emocjonalne, uwarunkowane przedstawieniem świata uczuć i zmysłów w wysoce zsubiektywizowany sposób, ze szczególnym upodobaniem do zapisu przelotnych i niewyrażalnych pojęciowo stanów psychologicznych. Szczególną rolę odgrywa tu pejzaż, przyroda. Przyroda jest w ciągłym ruchu, w coraz to nowych postaciach i formach. Interesująco przedstawia się też forma brzmieniowa analizowanych utworów. Takie elementy muzyczne jak powtórzenia, inwersyjny tok wypowiedzi, operowanie paralelizmem składniowym, pauzą, wprowadzanie licznych onomatopei i konstruowanie słów w pewne wyczuwalne struktury brzmieniowe pełniły bardzo ważną funkcję.

**Słowa kluczowe:** liryczna miniatura, impresjonizm, romantyzm, pejzaż, samotność, niepokój

**Ключевые слова:** лирическая миниатюра, импрессионизм, романтизм, пейзаж, одиночество, беспокойство.

**Key words:** lyric miniature, impressionism, romanticism, landscape, solitude, anxiety.